## МЕРКАВАННІ

**Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі Беларусі:**



— Большасць маладых людзей сёння атрымліваюць інфармацыю ў інтэрнэце. Якая гэта інфармацыя, да чаго там заклікаюць, якія каштоўнасці прывіваюцца — гэта пытанні, актуальныя для ўсіх нас. Наша агульная задача ў тым, каб інфармацыя была накіравана на інтэграцыйныя працэсы. Пры гэтым інтэграцыйныя ў плане разумення, што беларусы і расіяне ментальна і гістарычна блізкія і родныя людзі і народы. Мы павінны не згубіць важнае: што разам мы мацнейшыя, што беларуска-расійская эканамічная прастора — гэта карысць, што рэалізацыя нашых сумесных інфармацыйных праектаў накіравана не проста на абмен інфармацыяй, а на выбудоўванне трывалай будучыні нашых народаў.

**Алег РУМО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак:**



— Беларусь здзейсніла істотны скачок наперад у трансплантлагіі. Калі казаць пра ўзровень развіцця донарства, то ў нашай краіне ён складае 23,2 на 1 мільён насельніцтва, у Расіі — 3,3 на 1 мільён насельніцтва. У Расіі ёсць рэгіёны, якія размешчаны побач з намі, — Масква і Маскоўская вобласць, Санкт-Пецярбург, дзе ўзровень развіцця донарства складае прыкладна 14–15 на 1 мільён насельніцтва. І тут у нас добрыя перспектывы для супрацоўніцтва.

Калі мы аб'яднаем нашы намаганні з пункту гледжання стварэння каардынуючага цэнтра — наднацыянальнай сістэмы донарства органаў і іх трансплантацыі, які будзе дапамагаць пацыентам у складанай сітуацыі, калі орган патрэбен сёння ці цяпер, то гэта будзе першым крокам для фарміравання такой наднацыянальнай сістэмы, якая існуе ў Еўропе альбо, напрыклад, паміж Скандынаўскімі краінамі. Калі расійскі бок падтрымае гэтую ініцыятыву, то гэты праект стане добрым узорам інтэграцыі дзвюх краін. Гэта важны аспект, які будзе аб'ядноўваць нашы народы.

## РЭГІЁНЫ

# НЕ ГАНДЛЕМ АДЗІНЫМ

### Спікеры верхніх палат сустрэліся з губернатарамі і старшынямі выканкамаў

**Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі — гэта ўнікальная пляцоўка для сустрэчы не толькі дзелавых колаў з усіх куткоў нашых краін, але і непасрэдна ўлад. На палях мерапрыемства за некалькі гадзін да пленарнага пасяджэння адбылася сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча і старшыні Савета Федэрацыі Валянціны Мацвіенкі з кіраўнікамі рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь і суб'ектаў Расійскай Федэрацыі.**



Фота БЕЛТА.

«Мы не павінны спыняцца ў развіцці, а павінны выкарыстоўваць новыя формы работы, якія будуць садзейнічаць павышэнню канкурэнтаздольнасці нашых эканомік», — заявіў спікер верхняй палаты беларускага парламента. Гэтаму ў тым ліку садзейнічае і правядзенне такіх мерапрыемстваў, як Форум рэгіёнаў, лічыць Міхаіл Мясніковіч.

Пры гэтым Валянціна Мацвіенка адзначыла, што сучасныя ўмовы развіцця сусветнай эканомікі патрабуюць ад краін новых падыходаў ва ўзаемадзеянні, і Беларусі, і Расіі яны якраз і патрэбны. На яе думку, дзвюм краінам неабходна пераходзіць ад гандлёвага супрацоўніцтва да рэалізацыі новых перспектыўных сумесных праектаў і стварэння сумесных вытворчасцяў. Старшыня Савета Федэрацыі лічыць, што паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі дзейнічае мноства пагадненняў аб супрацоўніцтве, але не ўсе з іх выконваюцца. Таму варта актуалізаваць дакументы аб партнёрстве і пры неабходнасці дапоўніць іх планамі на перспектыву. Важна, каб сінхранізацыя заканадаўстваў дзвюх краін магла б сапраўды зняць многія пытанні, зазначыла Валянціна Мацвіенка і прапанавала ўдзяліць гэтай тэме асаблівую ўвагу.

На мерапрыемстве таксама абмяркоўвалася і тэма стварэння беларускага квартала ў Санкт-Пецярбургу. Пра гэта паведаміў губернатар паўночнай расійскай сталіцы Георгій Палтаўчанка і дадаў, што за сродкі гарадскога бюджэту праводзіцца конкурс на найлепшае архітэктурна-планіровачнае аблічча будучага беларускага квартала, і пасля там будуць працаваць менавіта беларускія будаўнікі. У той жа час губернатар канстатаваў, што асобныя бюракратычныя бар'еры ў заканадаўстве тармозяць рэалізацыю праекта. «Раз мы працуем сумесна над прарыўнымі праектамі, у нас і заканадаўства павінна быць адпаведнае», — падкрэсліў ён.

## НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

# «ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ» Ў ЗАКАНАТВОРЧАЙ СФЕРЫ

### Падчас работы форуму тэма адной з секцый была прысвечана стасункам паміж рэгіёнамі

**Вынікі супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы за 20 гадоў, перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва ў сферы эканамічных адносін, роля гарадоў і раёнаў ва ўмацаванні сувязяў паміж рэгіёнамі нашых краін, забеспячэнне роўных правоў грамадзян дзвюх дзяржаў... Гэтыя і іншыя пытанні былі разгледжаны падчас работы секцыі «Ад рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі да супрацоўніцтва гарадоў і раёнаў: новыя магчымасці і перспектывы», што адбылася падчас IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**

— Выконваючы даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сталі актыўна супрацоўнічаць і нашы прадстаўнічыя органы — Саветы дэпутатаў у Беларусі, заканадаўчыя сходы і абласныя Думы — у рэгіёнах Расіі. Вынікам такога ўзаемадзеяння сталі пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі, планы мерапрыемстваў, якіх толькі ў гэтым годзе было падпісана больш за 40, — паведаміў **Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, мадэратар секцыі ад беларускага боку.**

Па яго словах, такое супрацоўніцтва дае і эканамічны эфект. Так, у студзені — красавіку гэтага года аб'ём узаемнага гандлю таварамі з Расіяй склаў $9,6 млрд і ў параўнанні з адпаведным перыядам 2016-га павялічыўся на 26,6%. У 2017-м гандаль ажыццяўляўся з 79 расійскімі рэгіёнамі, пры гэтым Беларусь экспартавала прадукцыю ў 79 рэгіёнаў і імпартавала тавары з 75 рэгіёнаў.

У «дзясятку» лідараў, якія імпартуюць тавары з Беларусі, традыцыйна ўваходзяць Маскоўская вобласць, Масква, Смаленская вобласць, Санкт-Пецярбург, Бранская і Кемераўская вобласці, Рэспубліка Татарстан, Краснадарскі край, Ніжагародская і Ленінградская вобласці. На іх долю прыпадала 72,5% беларускага экспарту ў Расійскую Федэрацыю. У сваю чаргу, у «дзясятку» лідараў, якія пастаўляюць тавары ў Беларусь, увайшлі Цюменская, Смаленская і Маскоўская вобласці, Масква, Рэспубліка Татарстан, Санкт-Пецярбург, Пермскі край, Арэнбургская, Ленінградская і Ніжагародская вобласці. На іх долю прыпадала 74,4% расійскага імпарту ў нашу краіну .

— І здаецца, усё добра. Але давайце будзем сумленнымі перад самімі сабой: не такога выніку мы чакалі ад Саюзнай дзяржавы 20 гадоў таму. Дзіўная сітуацыя атрымліваецца: на міжнародных пляцоўках — мы адно за адным гарой, а як толькі вяртаемся дадому — адразу пра ўсё забываемся. Таму нашы рэгіёны, раёны, гарады, сельскія паселішчы проста абавязаны, можна нават сказаць, асуджаныя стаць сувязным звяном паміж нашымі дзяржавамі, — лічыць Аляксандр Папкоў. — Супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі нашых краін павінна стаць рэальнай рухаючай сілай і напоўніць канкрэтным зместам увесь працэс развіцця Саюзнай дзяржавы. Мы абавязаны вырашаць задачы на перспектыву, пашыраць інвестыцыйнае супрацоўніцтва, пераходзіць ад простага гандлю да больш эфектыўных доўгатэрміновых і высокатэхналагічных формаў работы, умацоўваць узаемавыгадныя адносіны паміж рэгіёнамі.

А для гэтага, вядома ж, патрэбны маштабныя сумесныя праекты. Так, на думку беларускага сенатара, саюзныя праграмы з'яўляюцца дзейснай формай узаемадзеяння для рэалізацыі патэнцыялу нашых краін. Аднак удзел галіновых дзяржаўных органаў у фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы не ў поўнай меры адпавядае магчымасцям іх навукова-тэхнічных і інавацыйных патэнцыялаў.

— Саюзная дзяржава — гэта не толькі міжнародныя дагаворы і пагадненні, не толькі тэрыторыі, прамысловыя аб'екты, фінансавыя патокі і інвестыцыі. Гэта ў першую чаргу людзі. Беларусь і Расія павінны быць стабільнымі і квітнеючымі не толькі ў буйных гарадах. Наша галоўная мэта — каб кожны населены пункт, кожная, самая маленькая вёска былі добраўпарадкаванымі і давалі магчымасць жыць на годным узроўні. Рэгіёны не атрымаюць развіцця, пакуль туды не прыедуць людзі. Чалавечы фактар у гэтым выпадку адыгрывае вырашальную ролю, — упэўнены сенатар.

У сваю чаргу **Дзмітрый АЗАРАЎ, старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па федэратыўным уладкаванні, рэгіянальнай палітыцы, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы,** адзначыў, што тэма секцыі была выбрана не выпадкова. І работа па абмене вопытам у сферы мясцовай улады паміж Беларуссю і Расіяй актывізуюецца на працягу ўсяго мінулага года, з трэцяга Форуму рэгіёнаў. «І гэта вельмі карысны вопыт. Мы ўжо дамовіліся з маім беларускім калегам Аляксандрам Папковым, што на наступны год вынудуем нашу сумесную работу яшчэ больш сістэмна, планава, намецім шэраг мерапрыемстваў, абменяў дэлегацыямі. Але хачу адзначыць, што ўжо ёсць сур'ёзны вопыт міжрэгіянальнага, міжмуніцыпальнага супрацоўніцтва, і нам варта яго развіваць, бо тут увесь патэнцыял не выкарыстаны», — паведаміў ён.

Па словах Дзмітрыя Азарава, шмат пытанняў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ляжыць і ў сферы эканомікі. «Мы можам угаворваць бізнес, што трэба наладжваць партнёрства. Але бізнес працуе там, дзе выгадна. Таму мы як заканадаўцы павінны стварaць спрыяльныя ўмовы для развіцця бізнесу, вытворчай кааперацыі паміж нашымі рэгіёнамі і краінамі. Таму мы пасля секцыі сышлі з дамашнім заданнем у заканатворчай сферы на год наперад», — сказаў ён.

**Паміж калегіяльнымі органамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па выніках работы секцыі былі падпісаны наступныя пагадненні:**

✓ *Пратакол аб супрацоўніцтве паміж Саюзам расійскіх гарадоў (Расійская Федэрацыя) і Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;*

✓ *Пагадненне паміж Брэсцкім гарадскім Саветам дэпутатаў і гарадской Думай горада Іжэўска Удмурцкай Рэспублікі;*

✓ *Пагадненне паміж Глыбоцкім раёнам Віцебскай вобласці Рэспублікі Беларусь і Астроўскім раёнам Пскоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі;*

✓ *Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Віцебскім гарадскім выканаўчым камітэтам Рэспублікі Беларусь і адміністрацыяй горада Іркуцк Расійскай Федэрацыі.*

Усяго ў секцыі прынялі ўдзел 140 чалавек: кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі і Расіі, кіраўнікі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, старшыні раённых выканаўчых камітэтаў і Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь, старшыні абласных дум, заканадаўчых сходаў Расійскай Федэрацыі, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый.

Сярод прапаноў, якія былі сфармуляваны па выніках работы секцыі, прагучалі і такія: пашырыць практыку заключэння пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж рэгіянальнымі гандлёва-прамысловымі палатамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, правесці выстаўкі-кірмашы і іншыя мерапрыемствы таваравытворцаў у рэгіёнах-партнёрах. Акрамя таго, прапаноўвалася аказваць органам мясцовага самакіравання прыгранічных тэрыторый дапамогу ў пашырэнні сеткі гандлёвых дамоў і прадстаўніцтваў, правядзенні выставак-кірмашоў, сумесных культурных і спартыўных мерапрыемстваў. А таксама пашыраць сумесную інвестыцыйную дзейнасць па рэканструкцыі і мадэрнізацыі прамысловых прадпрыемстваў, больш актыўна прымяняць практыку здачы сельскагаспадарчай і іншай тэхнікі ў лізінг, фінансаваць найважнейшыя праекты Саюзнай дзяржавы непасрэдна з бюджэту Саюзнай дзяржавы, забяспечваць адно аднаго інфармацыяй па пытаннях інвестыцый дзейнасці і прыцягнення інвестыцый.

**Матэрыялы аб рабоце IV Форуму рэгіёнаў падрыхтавала Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by